*Н.Б. ВАВІЛАВА*

# ПРАСТОРА ЛІТАРАТУРНА-МАСТАЦКАЙ КРЫТЫКІ Ў ІНТЭРНЕЦЕ

Анализируются и обобщаются процессы развития литературно-художественной критики в Интернете. Внешние и внутренние изменения, которые характеризуют современную сетевую литературно-художественную критику, позволяют говорить о зарождении принци-пиально нового типа критической медиации в пространстве глобальной сети.

The processes of development of literary-art criticism at Internet are analyzed and generalized in the article. External and internal modifications of contemporary literary-art criticism at cyberspace allow to talk about the fundamentally new type of critical mediation at worldwide web.

У працэсе развіцця сучаснай літаратурна-мастацкай крытыкі ўсё больш значную ролю адыгрывае Інтэрнет, які выступав не толькі як тэхнічны сродак распаўсюджвання інфармацыі, але і як прастора, дзе ўзнікаюць адметныя віртуальныя літаратурна-мастацкія праекты. Захоўваючы родавую сувязь з літаратурна-мастацкай крытыкай як відам літаратурна-мастацкай дзейнасці ў цэлым, Інтэрнет-крытыка вылучаецца спецыфічнымі, уласцівымі на сёння толькі электронным публікацыям, рысамі, сярод якіх на першае месца выходзяць гіпертэкставасць і інтэрактыўнасць. Аб'ектыўныя ўстойлівыя працэсы дыгіталізаванай інфармацыйнай прасторы - бязмежнасць, гіперзвязанасць, дэцэнтралізаванасць, даступнасць, камунікацыя ў маштабе гіперчасу, частковая «разарванасць» - патрабуюць адметнага, «сеткавага» мыслення ад аўтараў, пошуку новых вобразаў і мовы апісання. Пад уплывам гэтых заканамернасцей крытычны тэкст набывае новыя рысы ў форме і ў змесце.

Азначаныя працэсы хвалююць многіх спецыялістаў, прыналежных да літаратурна-мастацкай дзейнасці. Аднымі з першых загаварылі на гэтую тэму расійскія даследчыкі і крытыкі. Леў Аненскі, Наталля Іванова, Іна Булкіна, Мікіта Елісееў, аддаючы перавагу друкаваным носьбітам інфармацыі, у той жа час адзначалі адметную ролю Інтэрнета ў фарміраванні новай, маладаследаванай культурнай прасторы. Агульнае меркаванне, пануючае на мяжы стагоддзяў у расійскім мастацтвазнаўчым асяроддзі, выразіў крытык Міхаіл Эдэльштэйн, які зазначыў: «Разницы между критикой

бумажной и сетевой для меня просто нет... Более того, мне кажется, что и в будущем никакой особой сетевой критики не возникнет, и она по-прежнему будет отличаться от критики бумажной только способом публикации» (Эдельштейн 2003, http://old.russ.ru).

Сярод айчынных навукоўцаў да даследавання феномена сеткавай крытыкі шчыльна наблізілася доктар філалагічных навук, прафесар Таццяна Арлова, якая мае дыяметральна супрацьлеглы пункт гледжання. У манаграфіі «Театральная журналистика» беларускі вучоны адзначае асаблівую ролю дыгіталізацыі ў фарміраванні новага пласта літаратурна-мастацкай крытыкі. Падзяляючы гэты погляд, аўтар артыкула спрабуе даследаваць сеткавую крытыку, даць некаторыя неабходныя дэфініцыі і класіфікаваць Інтэрнет-тэксты ў залежнасці ад іх знешніх і ўнутраных характарыстык. Навізна праблемы, цяжкасці сістэматызацыі ў межах літаратурна-мастацкай крытыкі вымагаюць грунтоўнага эмпірычнага вывучэння акрэсленых пытанняў.

Сёння можна з упэўненасцю сцвярджаць, што фарміраванне прасторы літаратурна-мастацкай крытыкі ў віртуальным асяроддзі суправаджаецца ўзнікненнем спецыялізаваных web-старонак і сайтаў, прысвечаных абмеркаванню праблем культуры і мастацтва; фарміраваннем пэўнага кола карыстальнікаў інфармацыі; трансляцыяй твораў традыцыйнага мастацтва з дапамогай сеткавых рэсурсаў і ўзнікненнем на гэтай аснове адметнага Інтэрнет-мастацтва і Інтэрнет-культуры.

На фоне згаданых працэсаў ідзе фарміраванне новай Інтэрнет-культуры, якая ўзнікае ў той час, калі «сеть создает в себе новые формы культурного бытия и транслирует их в нашу повседневную жизнь» (Калмыков, Коханова 2005, 44). Усе гэта патрабуе ад крытыка - карыстальніка глабальнай инфармацыйнай прасторы - не толькі прафесійных, «философско-культурологических» ведаў, «особой методологической и логической культуры» (Яскевич 2003, 3), але і ўменне арыентавацца ў паняццях і прынцыпах дзейнасці сусветнай інфармацыйнай структуры.

Літаратурна-мастацкая крытыка дастаткова хутка і трывала ўвайшла ў віртуальнае асяроддзе. Каб зразумець гэта, трэба звярнуцца да нядаўняй гісторыі беларускай крытыкі, дакладней да 80-90-х гг. мінулага стагоддзя. Менавіта тады пачалося «пераасэнсаванне каштоўнасцей», што адлюстравалася не толькі ў ідэалагічных трансфармацыях, але і ў каранных сацыяльных пераўтварэннях, абумовіўшых змяненне «этических и эстетических критериев и приоритетов искусства» (Казьмина 2006, 9). Праявы азначанага працэсу - татальнае скарачэнне накладаў і імклівае знікненне многіх аналітычных выданняў - мы назіраем і сёння. Так, напрыклад, аналітыка-асветніцкі часопіс «Мастацтва» выходзіць зараз тыражом каля тысячы экземпляраў; «Нёман», «Маладосць» і «Полымя» - ад дзвюх тысяч да дзвюх з паловай; газеты «Культура» і «ЛіМ» амаль у аналагічным становішчы. Адзначым, што крызіс пранік значна глыбей: нават калі сёння вярнуць былыя наклады, будзе вельмі няпроста зноў далучыць да аналітычнага чытання аўдыторыю, якая за мінулыя 10-15 год прыстасавалася да новых крыніц інфармацыі: кабельнага тэлебачання і онлайнавых мас-медыа.

«Теперь уже все реже говорится о литературно-художественной критике как об особом виде литературного творчества, а все чаще как о вымирающем ремесле и об особом языке для описания заключенного в произведении искусства смысла» (Орлова 2001, 13). Менавіта ў пошуках новых магчымасцей для творчага існавання сур'ёзныя аўтары і звярнуліся да глабальнага канала інфармацыі. Прапанаваныя Інтэрнетам умовы - масавая аўдыторыя, неабмежаваны аб'ём друкаванага «аркуша», інтэрактыўнасць, адносная эканамічнасць - набылі попыт и актуальнасць.

Першыя матэрыялы з'явіліся ў web-прасторы на мяжы 1996-1998 гг. Аднак іх узнікненню і ўкараненню ў згаданым асяроддзі папярэднічаў перыяд станаўлення самаго байнэта.

Гісторыю беларускага Інтэрнета прынята адлічваць з 1991 г., калі на тэрыторыі рэспублікі ўзнік першы вузел электроннай пошты - сетка Internet/ Relcom. І, нягледзячы на тое, што байнэт- з'ява даволі маладая, маштабы ўплыву дыгіталізацыі на літаратурна-мастацкую дзейнасць засведчылі аб зараджэнні новай крытычнай прасторы, якая ўзнікла ў сувязі з важкімі аб'ектыўнымі прычынамі: па-першае, паступовае развіццё Інтэрнета ў нашай краіне дасягнула пэўных вышынь толькі ў 1999-2000 гг., калі кампанія Белтэлеком прапанавала сваім кліентам паслугу беспарольнага доступу; па-другое, менавіта ў гэты час адбылося значнае пашырэнне кола карыстальнікаў байнета, што дадаткова стымулявала стваральнікаў сайтаў. Сталі з'яўляцца не толькі камерцыйныя і інфармацыйныя web-праекты, але і скіраваныя на мастацкую тэматыку рэсурсы. Актыўная дзейнасць віртуальных бібліятэк, галерэй, сайтаў з mh3-калекцыямі, on-line СМІ і некаторых іншых мастацкіх праектаў, што ўзнікалі раней за крытычныя на працягу 1995-1998 гг., паўплывала на ўкараненне такой акадэмічнай з'явы, як крытыка, у такім звышдэмакратычным асяроддзі, як Інтэрнет.

Скіраваныя на мастацкую тэматыку матэрыялы, змешчаныя ў сетцы, можна падзяліць на тры канцэпт-блокі: **аналітыка** (аўтары - прафесійныя крытыкі), **інфармацыя** (аўтары - журналісты), **крэатыў** (аўтары - Інтэрнэт-карыстальнікі, якія імкнуцца стварыць альтэрнатыўную крытыку). Першыя дзве групы публікацый існуюць і ў традыцыйных СМІ, а трэцяя ўзнікла менавіта ў віртуальным асяроддзі дзякуючы актыўнасці web-спажыўцоў. Калі прасачыць заканамернасці дыслакацыі адпаведных матэрыялаў, можна зрабіць наступныя вывады наконт прыналежнасці тых ці іншых рэсурсаў:

1.Аналітыка: аўтарскія і тэматычныя сайты, web-часопісы, віртуальныя бібліятэкі.

2. Інфармацыя: рэсурсы інфармацыйных агенцтваў, сеткавыя копіі традыцыйных СМІ, on-line газеты, стужкі навін.

3. Крэатыў: блогі, фэн-зіны, інтэрактыўныя праекты (чаты, форумы), сайты віртуальных клубаў.

Першыя сеткавыя рэсурсы, на якіх знаходзілася літаратурна-мастацкая крытыка, з'явіліся на рубяжы XX-XXI ст. Сярод іх можна вылучыць «ARCHE» (часопіс кніжных аглядаў, інтэлектуальнай аналітыкі і літаратуры), сеткавую копію газеты «ЛіМ», праект «Літара.net». Менавіта гэтыя і некаторыя іншыя web-рэсурсы можна аднесці да носьбітаў традыцыйнай крытыкі на прасторах on-line.

Так, сайт www.litara.net узнік на пачатку XXI ст. дзякуючы намаганням групы энтузіястаў, прыналежных да айчыннага літаратурнага працэсу. На старонках рэсурсу карыстальнік можа пазнаёміцца з працамі такіх крытыкаў і літаратуразнаўцаў, як Аксана Бязлепкіна, Алесь Аркуш, Андрэй Курэйчык, Андрэй Хадановіч, Адам Глобус, Павел Абрамовіч. Для многіх аўтараў гэтага праекта Інтэрнет стаў выдатнай магчымасцю друкаваць уласныя творы, якія па тых ці іншых прычынах не прайшлі ў традыцыйных выданнях.

На сайце «Літара.net» у раздзеле «Пра праект» значыцца, што «Літара» - гэта новы інфармацыйны рэсурс, прысвечаны сучаснай беларускай літаратуры (http://litara.net/doc/info). Як высвятляецца пры больш дакладным знаёмстве з рэсурсам, ён створаны групай беларускіх пісьменнікаў і літаратурных крытыкаў з мэтай фарміравання пляцоўкі для стасункаў беларускіх творцаў і аматараў беларускай літаратуры, нейкага адмысловага community. Сайт з'яўляецца крыніцай інфармацыі пра тэндэнцыі, напрамкі і стылі беларускай літаратуры, месцам дыскусій паміж людзьмі розных перакананняў і поглядаў. Па словах аўтараў, на старонках «Літара.net» можна даведацца пра шляхі развіцця сучаснай беларускай літаратуры і падзеі ў жыцці пісьменнікаў.

Сярод важнейшых асаблівасцей гэтага праекта і іншых, падобных на яго web-рэсурсаў, можна выдзеліць інтэрактыўнасць, якая дазваляе аўта-

рам і чытачам мецъ тыя стасункі, што былі немагчымыя для прадстаўнікоў традыцыйнай крытыкі і журналістыкі. Іншымі словамі, сеткавыя мастацкія рэсурсы, і «Літара.net» у прыватнасці, фарміруюць і трансліруюць так званую інтэрактыўную крытыку, «переходящую с монолога на диалог со своим читателем» (Орлова 2002, 119). У гэтым сайтам дапамагаюць такія формы сеткавай камунікацыі, як форумы, старонкі для каментарыяў, e-mail. Яны дазваляюць мастацкім праектам ахапіць шырокую аўдыторыю рэцыпіентаў і прыцягнуць чытачоў да «зваротнай сувязі» - творчасці на старонках азначаных рэсурсаў.

Паступова вакол падобных праектаў пачынае фарміравацца пэўная садружнасць людз'ей, чытачоў, аб'яднаных агульнымі інтарэсамі і памкненнямі. Спачатку яны абмяжоўваліся тым, што шукалі ў байнэце неабходную інфармацыю. З цягам часу сфера іх захапленняў пашырылася: спажыўцы арганізоўваюць сеткавыя суполкі, клубы, абмяркоўваюць актуальныя тэмы на старонках форумаў і чатаў, змяшчаюць на спецыялізаваных web-рэсурсах водгукі на творы мастацтва. Назіраецца працэс пераўтварэння чытачоў у аўтараў, і з-пад іх «пяра» выходзіць сеткавая разнавіднасць літаратурна-мастацкай крытыкі.

На думку расійскага даследчыка Андрэя Каровіна, развіццё сеткавага мастацтва, і літаратуры ў прыватнасці, рухалася ў двух напрамках: «авторы и культуртрегеры, родившиеся в Сети, пытались вытащить лучшее за ее пределы, а несетевые литераторы, устав от унылого офлайна, пошли на необъятные просторы Сети, чтобы их творчество оценили вольные сетевые литераторы и читатели. Так они и встретились - профессионалы и начинающие - почти на равных - там, где все могут быть только равны и где субординация и цензура категорически запрещены» (Коровин 2005, 90).

У выніку свайго даследавання А. Каровін выявіў адну вельмі характэрную прымету мастацкай кіберпрасторы - дзяленне аўтараў на прафесіяналаў і аматараў (былых рэцыпіентаў). Згаданая акалічнасць справядлівая і ў дачыненні да віртуальнай літаратурна-мастацкай крытыкі, якая ў канцы мінулага стагоддзя набывае новыя рысы, пачынае распадацца на крытыку прафесійную і аматарскую. У дачыненні апошняй можна прымяніць наступны тэрмін, які існуе ў рускамоўнай практыцы адносна аматарскай журналістыкі, - «гражданская». Мы будзем карыстацца абодвума азначэннямі - **грамадзянская** і **аматарская.**

Паколькі аўтары грамадзянскай крытыкі большай часткай непрафесіяналы, то яе адрознівае адступленне ад строгай жанравай сістэмы, парушэнне норм літаратурнай мовы, эксперыменты ў галіне стылю. Так, напрыклад, у Інтэрнэце можна сустрэць зусім нетыповыя для традыцыйнай крытыкі формы: дыялогі і палілогі. Размоўны стыль матэрыялаў лічыцца ў web-аўтараў добрым густам. Адбіткам часу выглядае сеткавы і камп'ютэрны слэнг, які чалавеку недасведчанаму адразу зразумець проста немагчыма. У тэкстах назіраецца відавочная перавага інфармацыйнага пачатку над аналітычным.

Акрамя таго, большасць аналізуемых матэрыялаў вызначаецца інтэрактыўным узаемадзеяннем з чытачом. Аўтары імкнуцца да зносін з іншымі карыстальнікамі сеткі. Разам з тым іх цікавіць і пункт гледжання прафесійных крытыкаў, тых, хто здолеў бы правесці цэласны эстэтычны аналіз мастацкага твора. У гэтым кантэксце лагічным выглядае наступнае: павышэнне ўзроўню прафесійнага майстэрства былых рэцыпіентаў, неабходнасць больш актыўнага пераходу ў прастору Інтэрнэта высокаадукаваных крытыкаў для стварэння інтэлектуальнай альтэрнатывы - якаснай сеткавай крытыкі.

Адзначым, што крэатыўны напрамак літаратурна-мастацкай крытыкі стаў заканамерным адлюстраваннем агульнай постмадэрнісцкай сітуацыі, якая

склалася ў мастацтве канца XX ст. Тое, што раней лічылася «нізкім стылем», «благім густам», заваёўвае права на існаванне. Жаргонная лексіка, арго, вулічны слэнг, прастамоўныя выразы запоўнілі тэкставую прастору. Вітаюцца радыкальныя эксперыменты ў галіне жанра, кампазіцыі і слова. Эпісталярыі, гіпертэксты, дыялогі і палілогі навадняюць віртуальнае асяроддзе.

Вось тыповы прыклад так званай грамадзянскай крытыкі, змешчаны на форуме партала TUT.BY у рубрыцы «Кино»: «Посмотрел в очередной раз Великолепного с бесподобным Бельмондо в главной роли. Любопытно, картине почти 35 лет уже стукнуло, а в очередной раз убедился, что лучшего пародийного фильма на всевозможные шпионские и прочие боевики за все эти годы так и не сняли. Так всё это живо, легко и главное - смешно! И, конечно, отдельной строкой сам Жан-Поль, который сыграл под стать названию фильма - великолепно!» (Ourson 2006, http://forums.tut.by).

Безумоўна, асноўная функцыя падобных web-тэкстаў - фатычная. Іх аўтары, не прэтэндуючы на глыбокі аналітычны падыход, імкнуцца падзяліцца суб'ектыўнымі ўражаннямі з астатнімі карыстальнікамі Інтэрнета. У свеце вышэйазначанага паўстае лагічнае пытанне: ці правамерна далучаць падобныя сеткавыя публікацыі да літаратурна-мастацкай крытыкі?

Калі звярнуцца да энцыклапедычных крыніц, якія характарызуюць гэты від дзейнасці, можна, параўноўваючы наяўныя дэфініцыі, заключыць, што крытыка ўяўляе сабой майстэрства разглядаць, ацэньваць, аналізаваць нейкі аб'ект: твор, асобу, працэс. «Критика есть суждение о достоинствах и недостатках какого-нибудь... произведения» (Чернышевский 1950, 351).

Аднак мастацтвазнаўчыя крыніцы сведчаць і аб тым, што яшчэ задоўга да ўзнікнення Інтэрнета пачаўся працэс дэфармацыі, спрашчэння ў галіне літаратурна-мастацкай крытыкі. Так, напрыклад, у пачатку XX ст. вядомы рэжысёр, тэарэтык сцэнічнага мастацтва К. Станіслаўскі адзначаў: «Современные критики пишут в своих рецензиях личные мнения. Это самонадеянно, так как обществу интересны такие мнения только исключительных личностей, как, например, Толстого, Чехова. Высказывать личное впечатление или мнение в газетах имеет право не всякий из критиков. На это имел право лишь один гениальный Белинский, но он-то именно этим правом и не воспользовался. Он разбирал и оценивал творчество с помощью логики, знания, пытливости и чуткости гения. Теперь же мерилом является личное, не проверенное чувство критика» (Станиславский 1990, 343-344).

Сёння літаратурна-мастацкая крытыка ўсё больш схіляецца ў бок тэматычнай журналістыкі. Аб гэтым гавораць у сваіх працах айчынныя навукоўцы (Т. Арлова), іх расійскя калегі (Н. Ваганава, Н. Казьміна). Інфармацыйны, асабовы аспект публікацый выходзіць на першы план, засланяючы грунтоўны аналіз. Уважлівае даследаванне згаданай праблемы, эмпірычнае паглыбленне ў яе дазваляюць Т. Арловай сцвярджаць, што сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі спарадзілі недаверлівасць да старых ведаў і змянілі саму прыроду ведаў. «Многие современные произведения искусства строятся не по правилам логики, игнорируют понятность, провозглашают противоречия, неожиданности, парадоксальные чувства. Следовательно, и для критики старые логические законы не пример... Родилась и успешно функционирует новая разновидность литературно-художественной критики - критика журналистская» (Орлова 2005, 3).

Некаторыя сучасныя даследчыкі, прытрымліваючыся постмадэрнісцкай традыцыі, нярэдка разглядаюць літаратурна-мастацкую крытыку як ад метную мову для апісання сэнсу, што змяшчаецца ў творы мастацтва.

Такім чынам, той тып матэрыялаў, які ўзнік у віртуальным асяроддзі (грамадзянская крытыка, сеткавы крэатыў), можна аднесці да «новай крытыкі», а спрошчаную манеру пісьма сеткавых аўтараў - да новай формы сучаснага крытычнага акта.

Зыходзячы з гэтага, можна зрабіць наступныя вывады.

1. У літаратурна-мастацкую крытыку прыйшлі недастаткова падрыхтаваныя аўтары, пагэтаму перамены, якія характарызуюць сеткавую літаратурна-мастацкую крытыку, маюць пад сабой не столькі культуралагічную, колькі сацыяльную і эканамічную аснову.

2. Сеткавая літаратурна-мастацкая крытыка знаходзіцца на пераходным этапе і не з'яўляецца крытыкай у класічным разуменні. Яна ўяўляе сабой прадукт постмадэрнісцкага светаўспрымання з усімі ўласцівымі яму прыкметамі: адмаўленнем ад традыцый, форм і стылістычных арыенціраў; творчасцю выключна дзеля самавыяўлення аўтара; суб'ектыўным адчуваннем; суб'ектывісцкай трактоўкай мастацкага матэрыялу; дамінуючым інтуітыўным, а не аналітычным падыходам да аб'екта даследавання.

3. Літаратурна-мастацкая крытыка ў сетцы адрозніваецца пошукам новых форм і спосабаў адлюстравання мастацкіх працэсаў.

Кіберпрастора надзяліла web-аўтараў такімі магчымасцямі, як аператыўнасць і лёгкасць размяшчэння матэрыялаў. Гэтыя адметнасці не толькі спрасцілі працэдуру ўзаемаадносін чытача і аўтара, але і зрабілі магчымымі такія з'явы, як літаратура рэальнага часу, дзённікавасць.

Акрамя таго, новыя віртуальныя рэсурсы, выкарыстоўваючы магчымасць кастамізацыі, відавочна прыстасоўваюцца да пераваг канкрэтнага спажыўца інфармацыі.

Інтэрнет-карыстальнікаў цікавіць аўтарскі пункт гледжання, пачуцці і развагі крытыка. І як адказ на гэтае запатрабаванне ў сетцы нараджаецца аматарская крытыка, якая хаця і не дае дасканалага мастацка-эстэтычнага аналізу твора ці працэсу, але прапануе ёмкі, востры тэкст-замалёўку, пазнаёміўшыся з якім чытачы змогуць зрабіць уласныя вывады.

Адзначым, што даследаванне сеткавага літаратурна-мастацкага асяроддзя яшчэ толькі пачынаецца, аднак відавочным падаецца той факт, што прастора on-line стварае ўмовы для ўзнікнення новага тыпу літаратурна-мастацкай крытыкі. На сёння ў on-line-асяроддзі існуюць побач крытыка грамадзянская і традыцыйная. Першая актыўна выкарыстоўвае ўсе найноўшыя формы інтэрактыўнай камунікацыі (але яшчэ не паспела выпрацаваць уласцівыя дадзенай сферы мову і густ), а другая, наадварот, адстаючы ў плане тэхналагічных тонкасцей, падае прыклад прафесіяналізму ў галіне слова.

Шлях айчынных web-супольніцтваў невялікі. Тэрмін існавання літаратурна-мастацкай крытыкі ў Інтэрнеце яшчэ меншы, але той факт, што на сёння яна развіваецца хуткімі тэмпамі і набывае статус сур'ёзнага канкурэнта друкаванай крытыцы, бясспрэчны.

ЛІТАРАТУРА

Казьмина Н. Кто держит пуговицу // PRO SCENIUM. Вопросы театра. М., 2006. С. 6-1.

Калмыков А., Коханова Л. Интернет журналистика. М., 2005.

Коровин А. Эта великая степь - интернет, или Откуда к нам придет современная поэзия // Журналист. М., 2005. № 10. С. 90.

Орлова Т. Театральная журналистика. Теория и практика: В 2 ч. Мн., 2001-2002. Ч. 1. С. 13; 4.2. С. 119.

Орлова Т. Литературно-художественная критика в контексте художественной культуры нашего времени // Журналистика и искусство. Материалы научных чтений, посвященных творческой деятельности известного театрального критика, доктора филологических наук, профессора кафедры литературно-художественной критики Т.Д. Орловой / Редкол.: СВ. Дубовик (отв. ред.) и др. Мн., 2005. С. 3-5.

Ourson. Что мы недавно смотрели. http://forums.tut.by/showflat.php?Board=cultkino &Number=3151070&page=0&view=collapsed&sb=5&o=&fpart=

Станиславский К. Моё гражданское служение России. М., 1990.

Чернышевский Н. Избранные философские сочинения: В 3 ч. М., 1950. Ч. 1. С. 351.

Эдельштейн М. Это критика. http://old.russ.ru/krug/20030424_kritika.html

Яскевич Я. Прикладная интернетика: словарь терминов. Мн., 2003.

Паступіў у рэдакцыю 22.09.06.

***Наталия Барысаўна Вавілава*** - суіскальнік кафедры літаратурна-мастацкай крытыкі, кіраўнік Школы журналістыкі Установы «Палац пазашкольнай работы "Золак"». Навуковы кіраўнік - доктар філалагічных навук, прафесар Т.Д. Арлова.